Цана асобнага нумару 20 гр. | Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 12 Вільня, Нядзеля 20 Сакавіка 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Этнографічная маса — рэгіёналізм — свабода адзінак.

(Тры этапы польскай палітыкі адносна нац. меншасьцяў).

Польшч, заняўшы вялізарныя прасторы на ўсходзе, заселеныя беларусамі, літоўцамі і ўкраінцамі, бачыла тутака не сьвядомыя народныя адзінкі (суб'екты), а бачыла толькі этнографічную масу, з якой можна лёгка зрабіць палякоў. Б. прэм'ер Скульскі быў нават назначыўшы для беларусаў час іх вынарадаўленьня: 50 гадоў! За гэтыя 50 гадоў беларусы перасталі-б быць этнографічнай масай, а сталіся-б народам польскім.

Тэзу аб этнографічнай масе на ўсходзе быў паставіў і яе праводзіў блёк польскай правіцы, пачынаючы ад „хрысьц.-нарадовых" праз эндэцыю да Пяста, або гэтак званы „Хіена Пяст", які меў уладу аж да траўня 1926 году.

Паводле „Хіена-Пяста", работу над этнографічнай беларуска-ўкраінска-літоўскай масай у кірунку вынарадаўленьня мелі-б праводзіць: польскі касьцёл (а пасярод праваслаўных і спольшчаная царква); польская школа; паліцэйскі рэжым; вайсковае асадніцтва і колёнізацыя, замест справядлівай зямельнай рэформы; польскі самаўрад, пад зоркім вокам паветавых старастаў; выбарчая ардынацыя ў Сойм і Сэнат, так скроеная, каб туды папала найменш прадстаўнікоў ад нац. меншасьцяў, — усе гэтыя спосабы меліся тасавацца да „этнографічнай масы", каб яе чым-хутчэй і чым-лягчэй палітычна аслабіць, а потым палітычна зьнішчыць, прылучыўшы да „мацежы". Выславам гэтакай палітыкі „Хіена-Пяста" была мова б. прэзыдэнта Вайцехоўскага, якую ён сказаў, будучы пры канцы свайго ўрадаваньня ў Сьвянцянах і ў якой назваў польскі народ **прыраджоным** гаспадаром гэтага краю.

Аднак усе імкненьні Хіена-Пяста разьбіліся аб моцную волю беларускага сялянства. Выбары ў 1922 г. паказалі, што беларускі народ жыве і хоча жыць, пазьнейшая арганізацыя „Грамады", БХД, Сялянскага Саюзу і іншых палітычных і культурных арганізацыяў пасьведчылі, што беларускі народ нават умее арганізавацца, каб толькі яму не мяшалі... Тэза Хіена Пяста збанкрутавала, гэта мусілі прызнаць нават ягоныя павадыры.

На зьмену ей прышла новая тэза, якую пачалі ўводзіць у жыцьцё г. зв. „пілсудчыкі", якія сяньня гуртуюцца ў ББВР. Іхную тэзу і напрамак можна назваць **рэгіёналізмам.**

Паводле рэгіёналізму нацыянальнае жыцьцё меншасьцяў трэба разьбіць на акругі (рэгіёны), гэтыя рэгіёны мелі-б абымаць у сабе ўсе правы гаспадарчага, культурнага і грамадзкага жыцьця ня толькі нацыянальных меншасьцяў, але і палякоў, як прыраджонага гаспадара дзяржавы і кожнага рэгіёну. У рэгіёне не маглі-б існаваць напр. кооперативы беларускія, літоўскія ці ўкраінскія, але рэгіёнальныя; таксама культурна-прасьветныя арганізацыі насілі-б не нацыянальны, але рэгіёнальны характар, злучаючы ў сабе ўсе народнасьці рэгіёну; нават паслы ў Сойм ці Сэнат тварылі-б рэгіёнальныя групы... Найбольш заўзятым „рэгіёналістым" быў нябошчык Голувко: той усё жыцьцё (палітычнае, гаспадарчае і культурнае) ў рэгіёне хацеў падцягнуць пад гэтакі „рэгіёналізм".

Мэта рэгіёналізму — стушаваць і зацерці асобнасьць беларускага (і наогул „меншасьцёвага") народнага, грамадзкага і культурнага жыцьця і разьвесьці яго ў супольных рэгіёнальных арганізацыях. Аднак, пасьля доўгіх і розначкіх спроб выявілася, што ўвагнаць усіх і ўсё ў гэтыя „рэгіёны" было рэчай немагчымай, бо туды не хацелі ісьці ня толькі нац. меншасьці, але і польскія (не бэбэхаўскія) арганізацыі і рэгіёналізм збанкрутаваў (калі ня лічыць спроб тварэньня нейкага „рэгіёнальнага языка" на шпальтах „Kur. Wilenskaha" і ў віленскім радіо).

На зьмену рэгіёналізму прышоў новы курс, запачаткаваны дэклярацыяй мін. унутр. спраў Б. Перацкага 16.II. г. г. адносна ўкраінцаў і які можна назваць курсам **„свабоды адзінак"**. Міністар Перацкі ад імя ўраду заявіў, што калі ўкраінцы ў польскай дзяржаве будуць сапраўды лёяльнымі грамадзянамі, г. зн. прыхільнікамі сучаснага палітычнага рэжыму і будуць берагчы ўсе законы, то тады ўрад будзе адносіцца да іх, як і да ўсіх іншых грамадзян і дасьць магчымасьць карыстацца з правоў, якія належацца ўсім грамадзянам дзяржавы...

Гэта было сказана да ўкраінцаў, але няма ніякага сумніву, што словы міністра адносяцца і да ўсіх нац. меншасьцяў, а між іншымі і да беларусаў.

Згодна з гэтым правілам польскі ўрад ня прызнае ў межах дзяржаўнай суверэннасьці ні беларусаў, ні ўкраінцаў, ні літоўцаў за аддзельныя народныя адзінкі, маючыя свае асобныя народныя правы, а толькі бачыць **асобы** этнографічнай масы...

Дзеля гэтага галава украінскай парлямэнтарнай рэпрэзэнтацыі др. Д. Левіцкі, адказваючы міністру Перацкаму і вытknуўшы папярэднія натугі польскіх урадаў, якія праводзілі свае тэзы і збанкрутавалі, сказаў: „польскі ўрад не прызнае за намі характару аддзельнай праўнай адзінкі, не ўважае нас за палітычны суб'ект, не разглядае нас як сяброў аддзельнага вялікага народу, не прызнае адносна да нас ніякай нацыянальнай праблемы, не адносіцца да нас, як да палітычнай адзінкі, маючай сваю гістарычную традыцыю, а бачыць у нас толькі паадзіночных грамадзян польскай дзяржавы. Дзеля гэтага мы пэўны, што ніводзін кірунак палітычнай укр. думкі на гэтае новае правіла п. міністра ня згодзіцца і што яно (гэтае правіла) ня толькі не палагодзіць польска-ўкраінскіх адносін, але яшчэ больш іх завострыць і раней ці пазьней збанкрутуе". („Діло" 7.II.32.)

Цалком згаджаючыся зусім з высновам др. Левіцкага, мы ад сябе яшчэ хацелі-б дадаць наступнае: — мы ня хочам, каб нас, уважалі за этнографічную масу і адзінкі гэтай масы, якія можна дзяліць на рэгіёны і карыстацца галасамі пры выбарах.

Трымаючыся засады „вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі" мы жадаем, каб нас уважалі **за народ роўны ва ўсім з народам польскім.**

Іншымі славамі — адносіны да народных меншасьцяў у дзяржаве трэба абапёрці на **праве** ня толькі польскага народу але і беларускага, які мае ўсе правы да жыцьця, таксама як і народ польскі.

Беларусы!

Прыбліжаецца дзень 25-га сакавіка — 14-тыя ўгодкі Абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

У гэты дзень кожны Беларус(ка) у думках сваіх павінен затрымацца над тым, што значыць для чалавека, для Народу яговая культуральная, гаспадарчая і палітычная незалежнасьць, у каторай чалавецтва ўсіх часоў бачыла і бачыць свой найвышэйшы на зямлі ідэал. Гісторыя змаганьняў за гэту незалежнасьць сьведчыць, як ішлі за яе і йдуць на аўтар найцаньнейшыя ахвяры датуль, пакуль яна ня будзе здабыта.

Акт 25 сакавіка 1918 г. для Беларускага Народу мае вялікае значэньне — гэта пуцяводная зорка беларускай народнай думкі, якая павінна сьвяціць заўсёды ва ўсялякіх абставінах нашага народнага жыцьця, падтрымліваючы веру, што праўда пераможа і асьвеціць шлях да зьдзейсьненьня нашых народных ідэалаў.

Гэта маючы на ўвеце, Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні, як найвышэйшая нацыянальна-беларуская інстытуцыя на зах.-беларускіх землях, зьвяртаецца да ўсіх сьведамых адзінак, а тымболып — да ўсіх беларускіх арганізаваных асяродкаў і гурткоў у сваім крузе належна ўспомніць значэньне Акту 25.III.1918 г., паглыбляючы веру ў справядлівае яговае зьдзейсьненьне.

Праўда пераможцы мусіць!

Вільня, 13.III.1932 г. *БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАМІТЭТ.*

Прамова пасла Ярэміча ў Сойме ў справе касьцельных падаткаў.

Як ведама, урад падаў праект закону аб касьцельных падатках і гэты праект 8 г. м. разглядаўся ў Сойме.

У часе дыскусіі над гэтым праектам прамаўляў між іншымі і пасол Ярэміч, як прадстаўнік беларускага народу.

Пасол Ярэміч у сваей прамове між іншым заявіў, што ў нашым краю навучаньне рэлігіі каталікоў-беларусаў адбываецца ня ў роднай мове, а ў чужой, не зважаючы нават і на тое, што народ беларускі дамагаецца гэтай справядлівасьці. З гэтай справай арцыбіскуп Ялбжыкоўскі дае сам сабе раду гэткім спосабам — цьвердзіць у прамове пас. Ярэміч, — што пераносіць ксяндзоў-беларусаў з беларускіх парафіяў у парафіі небеларускія, назначаючы на іх мейсца ксяндзоў-палякоў, а ксяндзы—палякі ў беларускіх парафіях ня толькі ня вучаць беларусаў рэлігіі пабеларуску, але забараняюць пад карамі касьцельнымі чытаць беларускія газэты, як напрыклад „Бел. Крыніцу".

Пасол Ярэміч выразіўся *процiў* гэтага новага падатку на касьцёл.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Не забывайцеся аб сваіх студэнтах беларусах!

Складайце ахвяры на «Стыпэндыяльны Фонд»!

Новае польскае вайсковае асадніцтва.

Польскі Сойм дня 13 лютага сёл. году прыняў закон, якім заводзіць новае асадніцтва на беларускіх, украінскіх і літоўскіх землях.

Паводле гэтага закону, новае польскае асадніцтва будзе праводзіцца ў ваяводзтвах: Наваградзкім, Віленскім, Палескім, Валынскім і ў паветах: Горадзенскім і Ваўкавыскім —Беластоцкага ваяводзтва.

Закон аб паноўным асадніцтве ў нашым краю гаворыць так:

Міністар Земляробства ў паразуменьні з мін. Вайны перадасьць міністру Зямельнай Рэформы дзеля надзяленьня жаўнераў войска польскага:

а) лясныя ўжыткі, на каторых мін. Земляробства сьпярша загадае зьмяніць лясную гаспадарку на тып іншага гаспадараваньня;

в) знаходзячуюся ў адміністрацыі дзяржаўных лясоў зямлю, прыдатную для асадніцтва.

Ня ўсюды ўжо вырасьце лес, дзе яго вырубалі апошнімі гадамі. А рубалі яго ў нашым краю за апошнія часы не шкадуючы. На гэтых пасеках паселяцца польскія вайсковыя асаднікі.

А на гэту-ж пасеку прыглядаўся і цяпер цмокае „тутэйшы" аўгохтон краю, земляроб-селянін, пацяшаючы сябе думкай аб прырэзцы адтуль пры камасацыі да яго здрабнеўшай шнуравой яшчэ гаспадаркі. Ды аб гэтым баялі нашаму селяніну падчас выбараў у Сойм і Сэнат і „адзінкарскія" агітатары. — Але гэта былі толькі мры і балтаўня. Рэчаістасьць кажа выкінуць з галавы гэтыя думкі і аб іх забыцца.

Апрача гэтага, закон аб паноўным асадніцтве з дня 13.II.32 г. заводзіць і новы тып вайсковага асадніцтва, асадніцтва супалкавае.

Арт. 4 гэтага закону кажа, што арганізацыям вайсковых асаднікаў можна даць бясплатныя надзелы зямлі на мэты публічнага характару.

Як бачым, гэты новы закон аб асадніцтве прадбачыць ня толькі надзел пахатнай і ляснай зямлёй у нас паасобных польскіх асаднікаў, але і замацаваньне іх тут наглуха пры помачы адумысловых арганізацыяў, дорага ляленых і сыта кормленых сільнымі гэтага сьвету.

Ці не пара была-б гэтыя каштоўныя „пробы" ўжо пакінуць? Польскае ў нас асадніцтва бяз сталай дапамогі ўсёроўна усём няжыцьцяздольнае. А на сталую дапамогу— ці-ж так шмат мае польскі Ўрад грошай?

Соцыяльныя імкненьні Беларускай Хрысьціянскай Дэмакрацыі.

Ворагі беларускага народу і яго народна-палітычнага адраджэньня заўсёды баялі і цяпер баяць маласьведамым беларусам, што беларускім працоўным масам не падарозе з Б.Х.Д. А каб адгарадзіць шырокія масы беларускага сялянства ад уплываў Б.Х.Д., нікчэмненькія агенцікі ворага беларускага народна-палітычнага і соцыяльна народнага адраджэньня цьвердзяць, што Б.Х.Д. справы соцыяльнай наагул не парушае, бо Б.Х.Д.— гэта арганізацыя фашыстоўская, буржуазная, клерыкальная і г. д.

Вось-жа, каб наш селянін змог запярэчыць ілжы такога дробна-мяшчанскага паніча, вясковага гультая, або „вучонага" недавука, падаю тут разьясьненьні некаторых аддзелаў праграмы Б.Х.Д., асабліва тых пунктаў, якія найбольш датычаць справы зямельнай.

Узяўшы ў рукі Праграму і Статут БХД. мы знаходзім у гэтай праграме каля 20 параграфаў аб справах соцыяльных і адтуль даведваемся, што:

1) Б.Х.Д. *змагаецца з абшарніцтвам і капіталізмам*, бо ўважае ўласнасьць, зграмаджаную ў вялікай меры ў адных руках, крыўдай для працоўнага народу, а дзеля гэтага дамагаецца, каб

2) усе землі перавышаючыя працоўную норму былі перададзены на ўласнасьць і бяз выкупу беззямельным і малазямельным сялянам.

3) Б. Х. Д. уважае, што прыватная ўласнасьць ёсьць падставай цывілізацыйнага поступу грамадзянства і дзеля гэтага дамагаецца надзяленьня сялян зямлёй на ўласнасьць у разьмеры працоўнай нормы,—г. зн. даць сялянскай гаспадарцы такі лік дзесяцін зямлі, які гаспадар можа абрабіць сам з сваёй сям'ёй, або так-жа пры помачы аднаго— двух наймітаў у выпадку, калі ў якой сям'і з прычыны малалецтва дзяцей, старасьці, хваробы, калецтва, удоўства з малымі дзяцьмі і г. п. недахват рабочых сілаў для абрабленьня працоўнай нормы.

Апрача гэтага, БХД. дбае і аб эканоміцы агульна-народнай і дзеля гэтага дамагаецца толькі такой рэформы прыватнай уласнасьці, якая-б ня была супярэчнай з інтарэсамі беларускай народнай эканомікі.

Далей, мы знаходзім у гэтай праграме, што БХД імкнецца і да палепшаньня гаспадарчага палажэньня беларускай вёскі праз пашырэньне земляробскай культуры, сельска-гаспадарчай коопэрацыі, павялічэньня абшару ўпраўнай зямлі, а прадусім —асушкі балот і сенажацяў. БХД. змагаецца такжа і процiў выкарыстываньня вёскі горадам, бо стаіць за справядлівыя цэны на прадукты сялянскія і фабрычныя і ніколі не згаджаецца з сучаснымі цэнамі, што за адну карову ня купіш добрых ботаў, а авечка менш варта за фабрычны сякач.

У канцы праграмы аб соцыяльных справах, датычачых сельскай гаспадаркі, мы знаходзім і такі параграф: — Чужацкае ваеннае асадніцтва і такая-ж прыватная колёнізацыя беларускіх зямель, як цалком несправядлівая, павінны быць скасаваны.

Словам БХД., стоячы ў абароне беларускага народу, дамагаецца для народу поўных правоў народных і соцыяльных. А гэтакія дамаганьні і гэткія думкі ў народзе няпрошаным „апякуном" і страшны, бо калі народ даведаецца аб сваіх правох выплываючых з агульнага права прыроднага і ўсьвядаміць сабе сваю народную і сваю беларускую соцыяльную мэту, тады завясьці яго ў Макараў хлеў ня ўдасца.

Батрак з-пад Міра.

З беларускага жыцьця.

Паседжаньне Беларускага Нацыянальнага Камітэту (пленума) адбылося ў мін. нядзелю 13 г. м. На парадку дня быў між іншым рэфэрат пасла Яреміча аб сучасным палітычным палажэньні ў Сойме і справа сёлетняга сьвяткаваньня 14-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, якое прыпадае на дзень 25 г. м.

Да 1 га пункту: Бел. Нац. К-т прызнаў, што многія з уставаў прыманых на апошняй сэсіі польскага Сойму для беларусаў пад Польшчай вельмі некарысны, асабліва некаторыя, напр. прынятыя ўжо ўставы аб асадніцтве і аб школьніцтве. Прыняўшы пад увагу, што гэтыя ўставы знаходзяцца ў супярэчнасьці з абавязуючай яшчэ польскай канстытуцыяй і міжнароднымі дагаворамі, якія забясьпечываюць беларусам права на свабоднае разьвіцьцё, — пленум Камітэту даручыў Прэзыдыуму супроць гэткага аграніченьня правоў беларускага Народу адпаведна запратэставаць.

Да пункту 2-га: Дзеля таго, што сёлетнія 14-тыя ўгодкі Абвешчаньня Незалежнасьці Б. Н. Р. прыпадаюць ў Вялікую Пят-

Жыцьцё ў Маскве і СССР.

Нядаўна ў Нямеччыну вярнулася некалькі нямецкіх інжынераў, якія былі выехаўшы ў Саветы. Адзін з іх жыў доўгі час у Маскве і вось што расказвае аб тамашнім жыцьці.

Масква цяпер налічвае болей 3 мільёнаў людзей. Рух у ёй надта вялікі — адна бяда, што няма кватэраў. Кожны год прыбывае ў Маскву каля 200 тысяч народу, шукаючы працы, а дамоў збудавалі толькі некалькі дзесяткаў. Апроч савецкіх грамадзян, у Маскве прабывае каля 30 тысяч чужаземцаў, перадусім немцаў і амэрыканцаў, якія працуюць, або шукаюць працы ў сталіцы Саветаў. Палажэньне чужаземцаў, асабліва інжынераў і так зв. спэцаў, куды лепшае за савецкіх рабочых; аднак цяпер, калі дадзена большая палёгка савецкім „спэцам" з быўшых буржуяў, а так-жа нарасьлі маладыя савецкія сілы, значэньне і дабрабыт чужаземцаў пагоршыўся. Дзеля гэтага некаторыя чужаземцы кідаюць Саветы і выяжджаюць да хаты.

Перад калядамі бязбожнікі праводзілі сільную проціўрэлігійную прапаганду. Перад цэрквамі ўстраівалі мітынгі, ставілі галасьнікі і гэтым парадкам адцягвалі тых, што йшлі ў цэркву. Цэркваў асталося нямнога, на ўсю Маскву каля 5. Ёлак ня можна пад карай вялікага штрафу ані прадаваць, ані купляць; устраіваць калядныя ёлкі могуць толькі чужаземныя пасольствы, якія на куплю ёлак дастаюць спэцыяльныя дазволы. Прадаўцы ёлак, апроч штрафу, яшчэ карающца адняцьцем картачак на прадукты.

Дастаўку прадуктаў апошнім часам удалося трохі паправіць, але ня зусім. На вольным рынку дарагоўля пануе вялікая; па картачках можна дастаць у коопэратывах і разьдзельчых пунктах шмат таней, толькі ня ўсе маюць права да картачак. Найлепш абстаўлены так зв. „**закрытыя**" разьдзельчыя пункты (распределители), абслугоўваючыя толькі заграгічныя пасольствы. Там можна дастаць усяго.

У звычайных разьдзельчых пунктах і коопэратывах тавараў і прадуктаў не хапае. У кастрычніку было адкрыта некалькі крамаў так зв. „Торгсіну", дзе прадаюць тавары за чужаземную валюту. Там тавару колькі хочаш, абы была заграгічная валюта. Вокны „Торгсінаў" шыкарна абстаўлены і перад імі заўсёды поўна народу, які з цікавасьцю і смакам прыглядаецца да тавараў. Тыя, што атрымліваюць грошы з заграніцы, могуць у гэтакім „Торгсіне" купіць, што хочуць, а тыя, што ня маюць помачы з заграніцы, хоць паглядзяць.

Апошнім часам пачалі прадаваць з „Торгсінаў" тавары так-жа за золата і серабро, але тут шмат хто апарыўся. Бо да такога „буржуя", каторы прывёс золата ці серабро ў „Торгсін," падходзіць агент ГПУ і просіць пайсьці з ім для справкі ў галоўную ўправу ГПУ (даўней Чэка, тое самае, што палітычная паліцыя). А там як возьмуць у абароты: адкуль у цябе золата, а дзе ты яго дзяржаў, а можа ў цябе яшчэ ёсьць — дык бывае, што такі „купец" са страху ўсё высьпевае. Расказваюць аб адным багатым агародніку, каторага ўзялі ў ГПУ і каторы на дапросе прызнаўся, што мае закапаных 300 рублёў у золаце. Зараз-жа агенты на аўтамабіль і праўда — на тым месцы, дзе паказаў агароднік, выкапалі занітаваную банку, а ў ёй знайшлі залатыя манэты, толькі не на 300 рб., а на цэлых 850, залітых у масьле, каб не сапсаваліся... Але тут другая бяда: пачалі дапытваць „а дзе тыя 300 рб. аб каторых ты гаварыў? .. пакажаш — пусьцім, не пакажаш — ніколі ня выбярэшся адгэтуль". Так і астаўся агароднік сядзець у турме, бо мусіць другіх грошай ён і ня меў, а толькі хацеў ашукаць і падаў меншую лічбу. Так часам кончыцца пакупка ў „Торгсіне". Але да тых, што атрымліваюць валюту з заграніцы, ніякіх рэпрэсіяў і прычэпак не тасуецца; камуністы баяцца, каб арыштамі не адстрашыць ад сябе заграгічных капіталаў.

Гэтак расказвае нямецкі інжынер; а цяпер паглядзім, што кажа эканамічны рэфэрэнт вялікай нямецкай газэты „Berliner Tageblatt" — Гінтэр Штэін, які таксама быў у Маскве.

Гінтэр Штэін кажа, што вольнага гандлю ў Саветах няма, а ўсе крамы належаць да дзяржавы і існуе толькі дзяржаўны гандаль. Дзяржаўныя крамы падзелены на тры катэгорыі: коопэратывы, камэрцыйныя крамы і „Торгсіны".

Да коопэратываў упісаны работнікі і ўрадаўцы, якія атрымліваюць тавар і прадукты па цане, усталенай дзяржавай. У коопэратывах ня маюць права атрымаць тавар так зв. „лішэнцы", да якіх залічваюць духоўных, кулакоў і ўсіх тых, хто належаў да даўнейшага „буржуазнага" сьвету. Гэтыя „лішэнцы" ня маюць права голасу пры выбарах і ня могуць быць выбраны або назначаны на ніякую службу.

ніцу (25 сакавіка г. г.) і дзеля таго, што за год прыпадаюць такія-ж угодкі 15-тыя, якія настаноўлена адсьвяткаваць больш урачыста, Сход прызнаў за адпаведнае сёлетняе сьвяткаваньне аграначыць да ўрачыстага публічнага паседжаньня Нацыянальнага Камітэту.

Гэтакае паседжаньне назначана на дзень 25 г. м. на гадз. 18-ую ў памешканьні ўласным (Людвісарская 1—19).

З прычыны сёлетніх 14-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Б.Н.Р., пленум Бел. Нац. К-ту прыняў адумысловую адозву, тэкст якой падаём на 1-ай бачыне нашай сяньняшняй газэты.

З жыцьця Віл. Аддзелу Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры. У нядзелю 20 г. м. роўна а гадз. 16-ай у памешканьні ўласным (Людвісарская 1—19) інж. Клімовіч прачытае публічную популярную лекцыю на тэму „Гаспадарчыя патрэбы і магчымасьці беларускай вёскі.“ Уваход вольны.

З беларускага жыцьця ў Навагрудку. Стараньнем і сіламі мясцовай беларускай гімназіі у мінулы чацьверг 10 г. м. быў зладжаны ў мескім тэатры прадстаўленьне—канцэрт. Пастаўлена была п'еса Фр. Аляховіча „Дзядзька Якуб.“ На пачатку другога акту хор і аркестр гімназіі прадставілі беларускую вечарыну, на праграму якой злажыліся беларускія народныя песьні і нацыянальныя танцы. Рэжысэрыя вечара была ў руках вучыцеля гімназіі грам. М. Чатыркі, а кіраўніцтва хорам і аркестрам — вучыц. гімназіі грам. А. Валынчыка. Арганізацыя і выкананьне вечара было вельмі стараннае і ўдалося надзвычай добра. — Народу было шмат, усе засталіся вельмі задаволены і падмацаваны да дальшай працы на роднай ніве.

З краю.

Эканамічны ўпадак выганяе сялян з вёскі. З прычыны нязвычайна труднага палажэньня ў вёсках, што-раз часьцей здараецца пачуць, што сяляне кідаюць свае гаспадаркі і ўцякаюць у горад. Але і ў горадзе ня лепш, бо і тут тысячы людзей безработных і галодных.

Газэты падаюць, што ў Віленшчыне многа гаспадароў, у каторых забралі за падаткі апошні жывы інвэнтар — пашлі жабраваць. У Браслаўскім і Дзісьненскім пав. сёлета лік жабракоў узрос на 30 проц. у параўнаньні з 1930 г. Многія з вёскі ўцякаюць у горад. Ня лепш і на Палесьсі, бо і там сяляне кідаюць гаспадаркі і ўцякаюць у горад.

А сэквэстратары ўсё „выціскаюць“ падаткі. У вёсках падымаецца цэлая бура пратэстаў. Надовячы ў Ковельшчыне паўстала процiў сэквэстратара больш 300-лікая таўпа сялян і адабрала ад сэквэстратара забраную за падаткі карову і не дала паліцыі арыштаваць павадыроў гэтага паўстаньня.

У Маладэчаншчыне ўзноў здарыўся гэтакі выпадак: калі сэквэстратар з паліцыяй забіраў за падаткі апісаныя рэчы, гаспадар з жонкай пачалі не даваць. У выніку гэтага змаганьня — сэквэстратар аказаўся абабіты кіем да ўтраты прытомнасьці, а гаспадар — ранены штыхом у руку.

Палескі Давідгарадок так упаў эканамічна, што магістрацкая маемасьць пашла на ліцытацыю.

З Вільні.

„Wincenty Dunin-Marcinkiewicz poeta polsko białoruski“. Пад гэткім назовам у Вільні толькі што выйшла з друку кніжка, якую напісаў варшаўскі праф. Я. Голомбэк, як відаць з яе загалоўку, аб беларускім паэце з другой паловы мінулага сталецьця В. Д. Марцінкевічу. Кніжка агулам робіць добрае ўражаньне. Аўтар, пішучы аб нашым паэце старанна выкарыстаў багатую літэратуру, як тую, што ўжо была друкавана, так і тую, што дагэтуль знаходзіцца ў рукапісах. Аўтар усестаронна малюе Марцінкевіча, як беларускага паэта і як бацьку беларускай адраджэнскай мастацкай літэратуры.

Чытайце і пашырайце

„Беларускую Крыніцу!“

З газэт.

„Беларусы-палякі“ на Праваслаўе зор'ентаваліся.

У адным з нумароў „Бел. Крыніцы“, з прычыны выхаду ў сьвет часопісі „Голас Праваслаўнага Беларуса“, як органу нейкага няведамага, новага, царкоўнага К-ту, мы пісалі, што паводле чутак на чале гэтага Камітэту, хоць і не паказваючыся, стаяць найнавейшыя польскія ўгадоўцы, Астроўскі і Луцкевіч. Аказваецца, што гэныя чуткі былі праўдзівыя. Звычайна добра паінфармаваны аб беларускім жыцьці, асабліва аб жыцьці польскіх угадоўцаў, варшаўскі журнал „Sprawy Narodowościowe“, на балонцы 628 піша дасloўна: ...„Як праяў новага зацікаўленьня групы Астроўскага і Луцкевіча трэба адзначыць дзейнасьць на грунце царкоўным. Дзейнасьць гэта праявілася ў залажэньні новага беларускага царкоўнага К-ту, каторы ў працы сваей мае апірацца на праваслаўныя духоўныя ўлады. У дзейнасьці сваей гэта група навязала бліжэйшыя зносіны з рэктарам праваслаўнай духоўнай сэмінарыі Тучэмскім“.

Пішам аб гэтым не дзеля таго, каб было тут што паважнае, але дзеля грамадзкай маральнай характэрыстыкі пары гнядых: Луцкевіча і Астроўскага, для якіх найвышэйшым жыцьцёвым прынцыпам зьяўляецца кліч: лаві мамэнт і закідай вудачку, куды толькі ўздумаецца, — а можа і зачэпіцца якая, хоць дохленькая, рыбка!...

Здрадзіўшы „Грамаду“ і заасэкураваўшыся ў польскіх урадавых кругох, выракаючыся на працэсе „Грамады“ прад судзьдзёй сьледчым Падоскім сваей беларускасьці, Луцкевіч з празорнасьцяй лоўкага палітычнага афэрыста закідае вудачку ў кругі царкоўныя. Летам мінулага году ён адведаў Львоў і там прапанаваў свае ўслугі ў справе праводжаньня царкоўнай уніі сярод беларусаў праваслаўных, але нічога не дастаўшы за гэта (бо ж там знаюцца на ім!), стаўся „абаронцам“ Праваслаўя і залажыў праваслаўны камітэт. Дык слушна пісала „Бел. Крыніца“, што „бесы“ залазяць у царкоўную званіцу. Гэта настаяшчыя масонскія бесы!...

З.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Закладайце гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры!

З украінскага жыцьця.

„Браття, не вдавайтесь в тугу, а молитесь Богу і работайте в імя Матері нашої України безталанної“.

Т. ШЕВЧЕНКО.

Дзень сьмерці Вялікага Украінца Т. Шэўчэнкі 10.III. Украінскі народ сьвяткуе з вялікай урачыстасьцяй. Дзе толькі ёсьць украінцы, усюды, дзе закінуў іх лёс, у гэты дзень ладзяцца ўспаміны, якія разаграваюць душу творчасьцяй Тараса.

Дня 13.III с. г., у 71-я ўгодкі сьмерці паэта, наладзіў такія-ж успаміны Тараса Шэўчэнкі і Коужок Украінскіх Студэнтаў у *Вільні*, мастацка выкананым вокальным канцэртам.

У камэрцыйных крамах можа купляць кожны, але па вельмі высокай цане. У „Торгсінах“—той, хто атрымлівае з заграніцы моцную валюту.

Якія-ж цэны ў коопэратывах?

У коопэратывах па картачках, г. зн. у аграначанай колькасьці можна дастаць па такіх цэнах (пададзём тут паводле польскай валюты): 1 кілё жытняга хлеба 30 гр.; 1 кілё пшоннага хлеба 60 гр.; 1 кілё рыжу 1 зл. 60 гр.; 1 кілё бульбы 30 гр.; 1 кілё валовага мяса 4 зл.; 1 кілё цяляціны 7 зл.; 1 літр малака 1 зл. 20 гр.; 1 кілё масла 9 зл.; 1 кілё цукру 2 зл. 40 гр.

Цэны, як бачым, і ў коопэратывах не малыя, але яны яшчэ большыя ў так зв. камэрцыйных або вольных крамах. Там кілё валовага мяса каштуе аж 25 зл., літр малака 9 зл., кілё масла 76 зл., кілё цукру 11 зл., пара чаравік 270 зл. і г. д.

Чаму такая дарагоўля? А таму, што сяляне, злучаныя ў саўгасы і калгасы, ня маюць права нічога прадаваць, пакуль не здадуць дзяржаве свайго ўраджаю і таварных прадуктаў з свае гаспадаркі, а дзяржава, атрымаўшы ад сялян па сталай цане, прадае ўжо з вялікім заробкам. Асабліва кідаецца ў вочы дарагоўля валовага мяса і цяляціны; але трэба ведаць, што за зарэз цяляці або каровы ў савецкіх парадках даецца селяніну да 4 гадоў катаргі. Убой быдла належыць да дзяржавы.

Пры такой дарагоўлі няма дзіва, што людзі, якія жывуць самі на сябе, самастойна, бяруць за ўсё проста шалёныя грошы. Так напрыклад звожчык за праезд ад станцыі ў гасьцініцу патрапіць узяць на польскую валюту 100 зл., прачка, якая мые не ў савецкай прачкарні, а ў сябе дома, за памыцьцё хусткі да носа—2 зл. Кажуць, што бяручы менш пражыць ня можна. І праўда, купляючы прадукты на вольным рынку, як мы бачылі, трэба плаціць таксама шалёныя грошы.

У канцы паглядзім, што расказвае адзін чэскі інжынер і пасол у чэскі парлямант Я. Нечас аб жыцьці наагул у СССР. Перадусім Я. Нечас ня можа надзівіцца вялікаму фабрычнаму будаўніцтву, якое праводзіцца ў Саветах паводле найнавейшых зах.-эўрапэйскіх і амэрыканскіх прыкладаў. Адна бяда — гэта недахват фаховых савецкіх сілаў, затым прыймаюцца чужыя: амэрыканцы і немцы.

Найбольш кідаецца ў вочы у СССР дрэнны распадзел прадуктаў паміж насельніцтвам, апроч гэтага зусім няма мыла, людзі ходзяць абодраныя. Я. Нечас цьвердзіць, што ў такіх варунках чэскі работнік ня вытрымаў-бы і ўцёк бы, а расейскі ўсё перажывае. Можна заўважыць вялікі занядпад усякай рэлігіі, асабліва пасярод моладзі. Камуністычная школа так перарабіла пагляды моладзі, што яна, ня ведаючы, як было даўней, уважае камуністычную сыстэму за апошняе слова навукі. Калі Я. Нечас расказваў такой моладзі аб варунках жыцьця работнікаў у Чэхаславаччыне, яму не хацелі верыць. На Заходнюю Эўропу камуністычная моладзь глядзіць згары і з пагардай, як на краіну адсталую і рэакцыйную. Верыць яна фактычна ў „пяцігодку“ і гатова на найбольшыя ахвяры, каб правесьці пляны партыі. Старэйшае пакаленьне інакш глядзіць на камунізм, але ўлада цяпер ня ў руках старых, а маладых. Так як Мусоліні ў Італіі зварочвае ўвагу на маладое пакаленьне ўцягвае яго ў дзяржаўнае будаўніцтва, таксама і Саветы.

Пасярод моладзі ўжо не разумеюць інстытуцыі прыватнай уласнасьці. Моладзь па гарадох ня можа сабе прадставіць, каб які дом быў уласнасьцю аднаго чалавека. Судовых працэсаў за ўласнасьць вельмі мала — затым там адвакаты ня маюць чаго рабіць.

Апавяшчаючы камуністычную ідэю ўва ўсіх мовах СССР, камуністы дабіліся вялікіх перамен у жыцьці народным, пачынаючы ад Менска, а канчаючы на Ўладывастоку. Грамадзкае жыцьцё за 10 гадоў яны перавярнулі ўверх нагамі, за другія 10 гадоў яны спадзяюцца ізноў паставіць усё на ногі. У справах нацыянальных яны пастараліся адапхнуць ад працы старыя культурныя сілы, а на іх месца стараюцца прыцягнуць маладыя, камуністычныя. Моладзь нават нерасейскіх народаў у значнай частцы ідзе за камуністычнай партыяй.

Гэтак выглядае жыцьцё ў Саветах з апісаньня паважных людзей. Апісаньне гэтае даволі аб'ектыўнае, бяз непатрэбных казак, якіх так многа часам бывае ў газэтах, таму мы гэтае апісаньне памясьцілі для ведама і ар'ентацыі нашых чытачоў.

Wypiswajcie kataloh biełaruskich knih a z jaho abaznačanyja čyrwonym atramantam

knižki pa tannaj canie!

Biełaruskaja Kniharnia „Pahonia“: Wilnia, Zawalnaja wul. Nr. 6.

З Польшчы.

Сойм і Урад. Заканчэньне соймавай сэсіі прыбліжаецца. Дзеля гэтага зьявіўся на нарады Сойму праект закону аб шырокіх надзвычайных поўнамоцтвах для прэзыдэнта. Супроць гэткіх поўнамоцтваў с ймавая апазыцыя выступіла з вострай крытыкай.

Газэты падаюць, што ходзяць чуткі аб рэканструкцыі ўраду. Гавораць, што Ян Пілсудзкі, мін. скарбу, мае быць міністрам справядлівасьці.

Забастоўка вуглякопаў трывае далей. У двадцатым дні забастоўкі баставала на раняшняй зьмене 9821 работнікаў. Бастуючыя работнікі рашылі баставаць далей. Адбываюцца работніцкія дэманстрацыі, якія падтрымліваюць дух забастоўкі.

Пагроза ўзросту арміі безработных. У Польшчы цяпер налічваецца 349.271 асоб безработных. Гэтая армія безработных мае павялічыцца на 300.000 эмігрантамі з Францыі, якіх адтуль францускі ўрад высяляе з прычыны безрабоцьця і там. У мінулых тыднях вярнулася з Францыі ў Польшчу ўжо 50 тысяч эмігрантаў, а яшчэ мае вярнуцца 300.000 асоб.

Між гэтымі эмігрантамі ня мала ёсьць і нашых людзей, якія вернуцца ў згалелыя беларускія вёскі.

З заграніцы.

Ліга Народаў. Дня 3 г. м. у Жэнэве пачалася надзвычайная сэсія агульнага сабраньня Лігі Народаў. На гэту сэсію зьехаліся прадстаўнікі 50 дзяржаў. Прычына такога вялікага зьезду — вайна на Далёкім Усходзе, аб якой і гавораць на гэтай сэсіі Лігі, каб як-небудзь пагадзіць Японію з Кітаем.

З самага пачатку сэсіі напалі на Японію ў прамовах прадстаўнікі малых дзяржаў, а пасьля да гэтых прамоўцаў далучыліся і прадстаўнікі дзяржаў вялікіх.

Гэнае наступленьне на Японію малых дзяржаў, як піша эўрапэйская прэса, моцна падарвала палітычны прэстіж Японіі. Спадзяюцца, што пасьля гэтага Японія скора прыступіць да мірных перагавораў з Кітайцамі.

Перамір'е японскіх войск з кітайскімі пад Шанхаем. Пад націскам міжнароднай апініі, ваюючыя японцы з кітайцамі заключылі перамір'е пад Шанхаем. Дагавор перамір'я кітайцы выканалі, а японцы выкананьне дагавору адкладаюць. Дзеля гэтага пачалі ўкрапляць свае пазыцыі і кітайцы. Ці наступіць пасьля гэтага перамір'я мір — пакульшто няведама.

Японія перавозіць войска пад граніцу СССР. Заграничныя газэты падаюць, што ў Маскве кіраўнікі бальшавіцкай палітыкі вельмі трывожацца, што Японія, кончыўшы біцца пад Шанхаем з кітайцамі, перавозіць сваё войска пад граніцу СССР. Тыя-ж газэты пішуць, што і чырвонай арміі многа ўжо знаходзіцца на Далёкім Усходзе. Бальшавіцкія газэты падаюць, што японскае войска йдзе да граніцы СССР ад Харбіну ўздоўж Усходня-кітайскай чыгункі, але СССР ня будзе працівіцца гэтаму паходу аж да ст. Імяное, а калі-б японцы дайшлі да ст. Пагранічная, тады-б гэты паход выклікаў вялікія камплікацыі.

Праект Наддунайскай фэдэрацыі. Францыя намагаецца стварыць эканамічны саюз наддунайскіх дзяржаў: Аўстрыі, Вугоршчыны і Чэхаславаччыны, да якога прылучыліся-б яшчэ: Румынія і Югаславія. Францыя абяцае гэты саюз падтрымаць нават і фінансава. Рэч зразумелая, што гэта француская камбінацыя ськіравана ў бок поўнага аддзяленьня Нямеччыны ад Аўстрыі, а так-жа — адгараджэньне наддунайскіх дзяржаў ад эканамічных уплываў Нямеччыны. Адно цікава, што гэты францускі праект ня бачыць у гэтым наддунайскім саюзе Польшчы, што польская прэса адчула з болем і выступіла да гэтага францускага праекту крытычна.

СССР — краіна голаду і працы. Расея так-жа, як і ўвесь сьвет, перажывае страшны крызіс. Розьніца цяпер Расеи ад краёў капіталістычных толькі тым, што там няма безработных, але затое больш як дзе галодных. Прымусовая колектывізацыя і праводжаньне „пяцігодкі“ стварылі ў Расеі такі гаспадарчы хаос, што няведама, як бальшавікі з гэтага палажэньня і выйдуць. Работы многа, а карысьці ніякай. У выніку — 42 мільёны людзей галодных. Для гэтай галоднай масы бальшавіцкі ўрад змог даць толькі 53 мільёны пудоў збожжа.

—У пачатку гэтага м-ца ў Маскве студэнт Штэрн зрабіў напад на прадстаўніка нямецкага пасольства ў Маскве і выстрэлам з рэвальвэру раніў яго ў шыю. Штэрна будзе судзіць найвышэйшы бальшавіцкі суд; працэс гэты бальшавікі будуць перадаваць праз радіо.

Выбары прэзыдэнта ў Нямеччыне, якія адбыліся 13 г. м., аканчальных рэзультатаў не асягнулі, бо ніводзін кандыдат не атрымаў абсалютнай большасьці галасоў. Гіндэнбург атрымаў 18.659.304 галасы, Гітлер — 11 325 573 галасы, а ўсе іншыя абсалютную меншасьць галасоў. Паноўныя выбары адбудуцца ў наступным месяцы. Спадзяюцца перамогі Гіндэнбурга. Камуністы ў гэтых выбарах паказалі слабеючую сілу сваіх уплываў.

Кароткія навіны.

— У новастворанай Манджурыі ўрад пастанавіў стварыць 100 тысячную армію, якую маюць кіраваць японскія афіцэры.

— Кітайскі ўрад стварыў адумысную раду, якая мае арганізаваць карную экспэдыцыю проціў нова створанай манджурскай дзяржавы.

— Англія мае шмат клопату ў Шкоцыі і Уэльсі, бо там расьце і раскошна пашыраецца аўтаномны рух.

— Кароль сернікаў — Крэгер застрэліўся, бо даведаўся, што на міжнародным рынку ўпалі яго акцыі, дык баяўся, каб не зьбяднець.

— Дня 15 г. м. у Амэрыцы застрэліўся мільянэр Істман — мусіць таксама баючыся, каб не зьбяднець.

— Збожжа ўжо ня будзе танець. Бэрлінскі землярobска-дасьледчы інстытут выяўляе пагляды, што збожжа ўжо танець ня будзе, бо цана на збожжа асягнула найніжшую граніцу.

— Варажбіты. Досьледы даказалі, што дзе няма веры, там людзі шукаюць духовай пацехі ў забабонах і варажбе. Статыстыка выказвае, што ў Парыжу ёсьць 34 600 варажбітоў. Зарабляюць яны каля 200 франкаў у дзень. Варажбітоў больш як духоўнікаў і варажбіты народу больш каштуюць, як духоўнікі.

— У Варшаве ў мінулым тыдні здарылася сутычка паліцыі з камуністамі. Адзін камуніст забіты, а два ранены.

— Пахарон біскупа Бандурскага адбыўся на дзяржаўны кошт. Пахавалі ў Віленскай катэдры. Прыяжджалі хаваць Бандурскага прэзыдэнт з Варшавы і ўсе міністры.

Наша пошта.

Андрушкевічу. Калі хто ад Вас будзе ў Вільні, або будзе ехаць з Вільні да Вас, няхай зойдзе да нас і возьме для Вас кніжак.

Блізьняму. Напішыце ў Цэнтр. Урад Б.І.Г.іК., калі і якая ўлада забрала кніжкі з бібліятэкі, дык Цэнтраля патрэбуе звароту кніжак. Квіт перадалі Ц. Ур. Б.І.Г.іК., з газэтамі уладзім.

Украінскаму Катал. Саюзу. Дзякуем за прысланае.

Максім Го-кі. Няўжо-ж у Вас няма аб чым пісаць? Гмінныя арышты, здрада мужа і дурная трусьлівасьць сялян прад войтам нікому ня цікавыя і бяспрыкладныя, а на змаганьне з гміннымі блыхамі шкода месца ў газэце, бо ёсьць аб чым пісаць паважнейшым.

Янулю. Масоны — гэта сусьветная капіталістычная арганізацыя. Дзеіць яна тайна. Сярод беларусаў толькі некалькі асоб належыць да масанэрыі. Беларускія масоны сьпярша былі прымазаўшыся да „Грамады“, а цяпер папісываюць у „Бел. Звоне“. На аднаго Вы згадалі, гэты-ж Л. ёсьць масонскім „біскупам“ сярод беларусаў.

Худніцкаму і Вялічку. Аб бураках друкавалі мы ў № 18 і 19 „Б. Крыніцы“ у 1931 г. Скора выйдзе гаспадарчая кніжка, у якой будзе і аб бураках.

Батраку з пад Міра. Дзякуем, друкуем, пішыце больш.

Дзядзьку Гаўрылу. Дзякуем, надрукуем у наступным нумары.

С. Тат. Пісьмо атрымалі, парады дадзём.

Да нас пішуць.

КРЫХУ АБ РЭЛІГІЙНЫМ ЖЫЦЬЦІ Ў НАС.

Асінагародцы, Пастаўскага пав. Асінагародзкая праваслаўная парафія перажывала і перажывае цяжкія часы. Сьпярша ў нас быў сьвяшчэньнік, які надта запусьціў прыход праз сваю нядбаласьць у душпастырскай працы, а цяпер парахвію разьядае сэктанства.

Цяперашні сьвяшчэньнік узяўся за працу душпастырскую з вялікім запалам і энэргіяй, але не пабеларуску а памаскоўску. Высілкі і праца нашага сьвяшчэньніка неяк астаюцца ўсё бясплоднымі. Ня могуць дакладна прыхаджане зразумець добрых рэлігійных пачынаньняў сьвяшчэньніка, а сьвяшчэньнік ня можа ўліць у сэрца і сагрэць беларускай душы прыхаджан цяплом навукі Божай, бо ён маскаль і памаскоўску падыходзіць да гэтай сьвятой справы. Рэзультат з гэтага такі: дарэмныя высілкі сьвяшчэньніка ня спыняюць разьвіцьця сэктанства.

У апошнія часы каля нас вельмі пашырылася сэкта баптыстаў. Няма таго дня, каб сэктанты не перацягнулі кагоколечы ў сваю веру. Гэтымі днямі перайшла ў баптызм у нашай парахвіі цэлая сям'я. Даведаўшыся аб гэтым наш сьвяшчэньнік пашоў у вёску да гэтай сям'і і хацеў угаварыць яе, каб вярнулася з блуднай дарогі. Калі сьвяшчэньнік зьявіўся ў хату гэтай сям'і, там адбывалася баптыскае сабраньне. Было сабраўшыся больш дзесятка баптыстаў. Баптысты на сьвяшчэньніка не зьвярнулі ніякай увагі, нават ня ўсталі з мейсца пры ўваходзе сьвяшчэньніка з Эвангеліяй у руках. Пасьля сэктанты накінуліся на сьвяшчэньніка і каб не каталікі ды г. зв. няверучыя праваслаўныя, дык няведама што і было-б.

Прыкрае і сумнае гэта зьявішча. Калі далей так будзе, дык народ наш зьдзічэе. Над гэтым трэба прызадумацца і праверыць дасюлешнюю мэтоду і тактыку айцоў духоўных да нашага народу. Трэба з рэлігійна і царкоўна-грамадзкага жыцьця прагнаць вон палітыку. Трэба, каб царква служыла толькі Богу і народу. Дзеля гэтага трэба заводзіць у цэрквах на беларускіх землях беларускую мову і навучаць беларусаў праўдаў Божых пабеларуску.

Стары беларус.

ПОЛЬСКІ ВУЧЫЦЕЛЬ У БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ.

Бабаевічы, Нясьвіскага пав. Такі ўжо лёс беларусаў, што іхніх дзяцей вучаць папольску польскія вучыцялі. У нас таксама школа польская і вучыць нашых дзяцей польскі вучыцель. Наш вучыцель хоча навучыць „культурнасьці“ і нашых сялян. А „культурнасьць“ гэта мае быць выяўлена здыманьнем шапкі прад вучыцелям. Дзіўная гэтая „культурнасьць,“ калі стары дзядзька ды першы здымае шапку прад маладым вучыцелям. Мне здаецца, дык наш вучыцель таксама павінен быў-бы ведаць, што ветлівасьць вымагае, каб малодшы першы кланяўся старэйшаму. Гэта так панашаму. Папольску можа і інакш? Ня ведаю. Дык трымаймася сваей культуры і яе пашырайма. Польскую можам ведаць, але ёй праймацца нам ня трэба.

Бабаеўскі.

Рэдактар Ян Пазьняк.
Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня.
Выдавец А. Шутовіч.